# РЭЦЭНЗІІ

## БРУІЦЦА ТВОРЧАЯ КРЫНІЦА...

**Альфабэт: літаратурна-мастацкі альманах. Вып. 2 / Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; уклад. і рэд. А.Сабалеўскі. – Мн., 2008. – 341 с.**

Пад грыфам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў у 2008 г. выйшаў з друку другі выпуск літаратурна-мастацкага альманаха “Альфабэт”. Гэта з’ява не толькі на творчых дзялянках універсітэта, а і ў сферы беларускай культуры ўвогуле з’яўляецца сведчаннем студэнцкай і выкладчыцкай таленавітасці ў розных жанрах: драматургіі, паэзіі, прозы. Ёсць тут матэрыялы, звязаныя з навуковымі даследаваннямі, і крытычныя артыкулы. Змест альманаха адлюстроўвае даволі шырокае кола тэм і праблем, якія складаюцца ў арыгінальны прыгожы букет твораў і талентаў з адмысловым разуменнем, бачаннем, поглядамі, адносінамі да жыццёвых з’яў.

“Альфабэт” адкрываецца эпіграфам з твора студэнта універсітэта Антона Янкоўскага:

*Я збудую сабе краіну*
*Па запавету роднай матулі.*
*Назаву яе – Беларуссю*
*І нікому скарыць не дазволю.*

У прадмове “Ад укладальніка і рэдактара”, якая належыць Анатолю Сабалеўскаму, падаецца кароткая гісторыя стварэння “Альфабэта” першага выпуску. Ініцыятарам і аўтарам яго назвы быў вядомы драматург, публіцыст і празаік Алесь Петрашкевіч, які быў і першым рэктарам вучэбнай установы, дзе выпушчаны альманах, а затым кіраўніком курса спецыялізацыі “драматургія”. У падрыхтоўцы альманаха да выдання актыўна шчыравала паэтка і рэдактар, дацэнт Ніна Загорская, далучыўшы да гэтай справы сваіх выхаванцаў па спецыялізацыі “тэлерадыёдраматургія”. Яна ж і давяла альманах да выхаду ў свет. Другі выпуск “Альфабэта” і па арганізацыі, і па рэдактарскай працы лёг на плечы Анатоля Сабалеўскага.

Рыхтуючы альманах да друку, укладальнік карыстаўся вопытам папярэднікаў. Разам з тым уведзены новыя раздзелы: “З драматургічнай майстэрні” і “Даследаванні. Крытыка”.

Пачнем наш агляд з гэтых новых раздзелаў.

На аснове першага друкаванага твора Кандрата Крапівы “Вясна” студэнты спецыяльнасці “літаратурная работа” (спецыялізацыя “драматургія”, клас А.Сабалеўскага), пафантазіраваўшы, напісалі свае творы. Два з іх: “Вясна” (іранічны абразок) Любові Новікавай і “Вясна 22-га” Вольгі Бяловай, змешчаныя ў альманаху, – сведчаць пра драматургічныя здольнасці студэнтаў.

Змястоўна напісаны творчыя партрэты. У артыкуле Кацярыны Лапінай “Водсвет чалавечай цеплыні і дабрыні” (пра актрысу Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Стафанію Станюту) адлюстравана “жывое сумленне тэатра”. Зміцер Кармазін пад загалоўкам “Мой тэатр – маё жыццё” высвечвае постаць народнай артысткі Беларусі Марыі Захарэвіч. Эпіграфам з’яўляецца прысвечаны ёй верш Анатоля Вярцінскага. Хочацца прывесці хаця б адну вытрымку з размовы з актрысай: “Якое раней цудоўнае жыццё было ў нашым сталічным Доме літаратара! Там праводзіліся сапраўдныя святы мастацтва, святы высокага паэтычнага слова і таленавітай прозы. Літаратары і артысты вельмі сябравалі, таму ў пісьменніцкім Доме мы былі не гасцямі, а гаспадарамі. У той час да кожнага свайго выступлення мы завучвалі многа вершаў ці вялікія кавалкі прозы напамяць. Уяўляеце, колькі гэта трэба патраціць сваіх сіл і энергіі. Падчас выступлення

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вельмі хваляваліся, бо выступалі перад элітнай публікай”. А цяпер, на жаль, усяго гэтага няма, у Доме пісьменніка другія гаспадары.

Таццяна Бойка ў артыкуле “Штрыхі да творчага партрэта” прасочвае шлях народнай артысткі Беларусі Вольгі Клебановіч.

Вядомы рэжысёр і пастаноўшчык маштабных народных свят Мікола Макарцоў у артыкуле “Артысты гомельскай сцэны” з душэўнай цеплынёй расказаў пра заслужанага артыста Беларусі Фёдара Іванова і народную артыстку Беларусі Людмілу Корхаву.

У матэрыяле Людмілы Клімовіч “Шматок фактаў з дзейнасці кафедры тэатральнай творчасці” апавядаецца пра развіццё гэтай кафедры, расказваецца пра яе супрацоўнікаў.

З прыемнасцю хочацца адзначыць, што матэрыялы новых раздзелаў цікава чытаюцца і на належным узроўні адпавядаюць пастаўленай мэце.

Прадмова ж укладальніка і рэдактара заканчваецца добразычлівымі пажаданнямі будучым аўтарам і стваральнікам чарговага выпуску “Альфабэта”.

“Высокі бераг...” Менавіта на высокім прафесійным узроўні апрацавана радыёінтэрв’ю Зміцера Кармазіна з доктарам педагагічных навук, прафесарам, былым рэктарам універсітэта Ядвігай Дамінікаўнай Грыгаровіч. З “гутаркі-размовы” вымалёўваецца асоба жанчыны-рэктара, якая заслужана заняла сваё месца ў галерэі славутых беларускіх асоб.

Высокі бераг – гэта і сімвал, і жыццёвая рэальнасць, у якой фарміравалася асоба Яніны, Ядзі, Дамінікавай Ядзі (так яе называлі аднавяскоўцы). Шыракаплынная рака Беразіна каля Бабруйска, родная вёска Даманова, салавей на вішні, няпростыя жыццёвыя перапетыі прывялі яе, нарэшце, да цвёрдай пазіцыі: “Жыць трэба так, каб не перашкаджаць іншым і заставацца Чалавекам”.

Самым аб’ёмным у альманаху, што абумоўлена вучэбнай спецыфікай, з’яўляецца раздзел “Драматургія”. У ім змешчаны п’есы шасці аўтараў. Раздзел адкрываецца творам на сучасную тэму “SMS”. Аўтар Андрэй Карэлін валодае матэрыялам, уменнем кампазіцыйнай пабудовы, каларытнай абмалёўкай персанажаў, і гэта самым станоўчым чынам адбілася на п’есе.

З цікавасцю чытаецца драматычная казка Вольгі Бяловай “Залатое царства”, у якой спалучаны рэальнае, фантастычнае і містычнае. Аўтар добра ведае фальклорныя традыцыі, што выявілася ў перадачы атмасферы Купалля. Твор, што называецца, са станоўчай энергетыкай. Арыгінальная яе п’еса “Душа” – пра творчасць славутага і трагічнага лёсу мастака Урубеля, глыбока псіхалагічная, з філасофскім напаўненнем. Вуснамі Урубеля прамаўляецца шмат цікавых і арыгінальных думак. Вось адна з іх: «Акадэмікі шукаюць прыкметы хваробы ў маіх працах. Лічаць іх сумбурнымі, дзёрзкімі. “Дэмана” не разумеюць – блытаюць з чортам і д’яблам. Чорт з грэчаскай мовы – “рагаты”. Д’ябал – “паклёпнік”. Дэман – значыць “душа”. Дэман – пакутны чалавечы дух, які хоча пазнаць жыццё. Але не знаходзіць адказаў на свае сумненні. Няма яму спакою ні на зямлі, ні ў пекле».

Добрае ўражанне пакідае вытанчаная, сфантазіраваная з дзіцячых пазіцый, але вельмі сур’ёзная, з гуманнай асновай п’еса Таццяны Ламонавай “Малеча Гном”. Арыгінальны “абразок у сямі споведзях” “Сем смяротных” Любові Новікавай. У ім столькі ж і дзеючых асоб-персанажаў. Гэта розныя характары, сутнасць якіх высвятляецца ў сутыкненнях паміж імі.

Камедыя “Чортава Баба” Валерыі Куставай – таксама арыгінальны твор і таленавіта напісаны. У аўтара добрае пачуццё камічнага. Гумарыстычна пададзены дзеючыя асобы. Дамініка – маладая, дзябёлая ды прытым зграбная дзяўчына ў расхрыстаных пачуццях (цікава!) – і Чорт – сучасны малады здаровы чорт на імя Арыман (таксама цікава!). Падзеі твора паказаны праз камедыйна-гумарыстычную прызму.

Заканчваецца раздзел творам Кацярыны Пашук “Знаёмая гісторыя”. Нявялікі абразок, але на вельмі сур’ёзную побытавую тэму, звязаную з каханнем, рэўнасцю, рукапрыкладствам і сямейным шчасцем.

Усе творы раздзела “Драматургія”, на нашу думку, маюць права на сцэнічнае ўвасабленне, а пальма першасці, як мы мяркуем, належыць Вользе Бяловай. Большыя ці меншыя лаўры заслугоўвае кожны.

Раздзел “Паэзія” засведчыў, што і гэты род літаратуры па плячы студэнтам і выкладчыкам універсітэта. Адкрываецца ён вершам Антона Янкоўскага “Я збудую сабе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краіну”. Верш-мара з вельмі прыгожым жаданнем. Будаўнік сваёй краіны заяўляе, што яна “будзе прыгожай, як кветка”, “магутнай, як вецер”. А таксама

*Незалежная, вольная, шчырая,*
*Самастойная, з межамі роўнымі,*
*З мовай роднай, прыгожай, пявучай,*
*Што, як Маці, нам дадзена Богам,*
*На якой мы малітву чытаем,*
*Каб над хлебам пахучым краіны*
*Не кружыла драпежнікаў зграя.*

Юлію Гарэзу хвалюе тэма Беларусі, пра што яна заяўляе ў вершах “Зварот да Каліноўскага”, “Напамін пра Беларусь” і “Віншую?..”

Вопытная паэтка Ніна Загорская, мяркуючы па змешчаных творах, знаходзіцца ў пошуку новага кірунку сваёй паэзіі. Выразна адчуваюцца памкненні да выкарыстання верлібра і да філасафічнасці: “Спыніла музыка асенняя мяне”, “Пераадольваю сябе...”, “Нядзельны верш”.

Парадавала сваёй паэзіяй Алена Багамолава. Ёсць узровень, узяць хаця б такое:

*Клыпае крок у крок,*
*Кульгае след у след*
*Рабаўнік маіх сноў*
*Мой незямны сусед,*
*Месячык востры, двурогі.*

Вельмі прачулы верш пра вішню і шчымлівы пра памерлага суседа. Увогуле Алена Багамолава валодае добрым паэтычным пачуццём і тонкай назіральнасцю.

Любоў Даніленка – майстар вершаваных прысвячэнняў. Паэтычныя здольнасці выявіла Вольга Бялова, даволі выразна перадаў атмасферу свята і адносіны да яго Зміцер Зорыч.

Раздзел “Проза” прадстаўлены жанрам апавядання малых формаў Антона Янкоўскага. Трэба сказаць, што гэтая форма ім асвоена даволі дасканала. На добрым узроўні напісаны твор “Мы вучымся быць людзьмі”, як, дарэчы, і іншыя апавяданні.

Такая вось літаратурна-мастацкая панарама другога “Альфабэта”. Пажадаем яму добрых чытачоў і наступных выданняў.

***Я.М.Адамовіч,***
*кандыдат філалагічных навук,*
*дацэнт*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ